# ВЕРАШЧАКА МАРЫЛЯ АНТОНАЎНА



Нарадзілася ў 1799 г. Дачка ўладальніка маёнтка Туганавічы (за 1 км ад в. Карчова Баранавіцкага раёна) Антона Верашчакі. У маёнтак Туганавічы да свайго сябра па Навагрудскай дамініканскай школе Міхала Верашчакі часта прыязджаў Адам Міцкевіч. Тут у 1818 г. ён пазнаеміўся з Марыляй і пакахаў яе, хоць дзяўчына была ўжо заручана з графам Путкамерам. Самыя пяшчотныя лірычныя вершы Міцкевіч прысвяціў свайму першаму каханню. У лютым 1821 г. адбылося вяселле Марылі і графа Путкамера, і неўзабаве маладая жонка перасялілася ў маёнтак мужа Больценікі. Хутка іх сустрэчы аднавіліся. У 1821 г. паэт правёў два тыдні ў Больцeніках як госць Марылі, графіні Путкамер. Іх сустрэчы адбываліся ў старым парку каля валуна, на якім паэт зрабіў насечку ў выглядзе крыжа, і ва ўрочышчы Гаік каля парку. Бытуе легенда пра бярозу, якую быццам бы спецыяльна для Марылі пасадзіў Адам. Людзі кажуць, што і ў сонечныя дні лісты бярозы былі вільготнымі ад тугі па каханаму. Калі Марыля памерла, у яе бярозу ўдарыў гром, а вакол вырасла сотня іншых бяроз – дало ўсходы насенне, якое Марыля рассеяла па ўсёй акрузе. Пахавалі Марылю ў стюдзёную зімовую пару, а вясной, кажуць старажылы, над магілай графіні паднялося воблачка – душа каханай паэта паляцела на сустрэчу з каханым. Памерла Марыля 27 снежня 1863 г. і пахавана ў Беняконях каля касцёла.

**Бібліяграфія:**


1.Верашчака Марыля Антонаўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў і інш.; маст. Э.Э.Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2004. – С. 102.

2.Светлае імя Марылі (Верашчака) // Воранаўская газета. – 2007. – 10 лістапада. – С. 6.

3. Косман, М. Праўда і легенда пра саперніка паэта. Ваўжынец Путкамер і Адам Міцкевіч /М. Косман // Адам Міцкевіч і нацыянальныя культуры. – Мінск, 1998. – С. 146—154.

4. Федорук, А.Т. Графиня Путткамер из Верещаков и её усадьбы / А.Т.Федорук // З гісторыі краю і лёсаў людзей Воранаўшчыны: матэрыялы навук. гіст.—краязн. канф. (г.п.Радунь, 11 снежня 2004г.) / рэдкал.: Д.С.Аляшкевіч (гал.рэд.) [і інш.]. – Ліда, 2006.— 300с., [8] л. іл.

7.Яструн, М. Мицкевич / пер.с польского А.Голембы. – Минск, 1963.

8.Wawrzykowska-Wierciochowa, D. AdamIMaryla. – Warszawa, 1990.